ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
25 07 2013 г.

Нечакана

ЯНЫ НЕ ХАЦЕЛІ Б ЖЫЦЬ НА МАНХЭТЭНЕ

Чым моладзь вабяць «малыя» гарады

Зараз праблема выбару ўніверсітэта стаіць перад выпускнікамі школ, гімназій і ліцэяў асабліва востра. У прыёмных камісіях завяршаецца прыём дакументаў. Праўда, калі сталі вядомымі вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, для адных выбар скараціўся, а для іншых — наадварот, пашырыўся.

Безумоўна, кіруючыся бацькоўскімі парадамі ці ўласнымі амбіцыямі абітурыент, хутчэй за ўсё, захоча стаць студэнтам прэстыжнага і (пажадана) сталічнага ўніверсітэта. Але ці ёсць маладыя людзі, якія насуперак усім канонам паехалі шукаць шчасця зусім не ў сталіцы сінявокай?

Ар'яна ЗАРЫФІ гэтай восенню стане другакурсніцай Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, а пакуль з цеплынёй расказвае пра год, які яна ўжо правяла ў 35-тысячных Горках:

«З'ехала з Магілёва, каб патраціць на адукацыю менш грошай: так ці інакш тут нават інтэрнат больш таннейшы. Тыя, хто ўвогуле нічога не ведаюць пра Горкі і пра акадэмію, здзіўляюцца: ну што я тут забылася? Але, праўда, ёсць і тыя, хто пагаджаецца са мной, што тут вельмі добра: людзі, планіроўка горада. Сапраўды, мне зручна хадзіць вучыцца: усе карпусы акадэміі (дарэчы, іх сямнаццаць!) знаходзяцца недалёка адзін ад аднаго, студэнцкі гарадок таксама блізка да месца вучобы.

Спачатку, вядома, было нязвыкла, але хутка ўсё нармалізавалася, мне нават спадабалася жыць у малым горадзе! Пасля правядзення ў Горках «Дажынак-2012» з'явілася шмат месцаў, якія можна наведаць у вольны ад заняткаў час, тым больш што вакол адны студэнты — не засумуеш. Мы маем магчымасць замест заняткаў фізкультурай наведваць басейн. Карацей, мне часам здаецца, што разнастайных забаў тут больш, чым сапраўднай вучобы! А яшчэ акадэмія дае шанц паехаць за мяжу, калі ты добра вучышся ды ўдзельнічаеш у грамадскай рабоце.

Ці шкадую я, што паступіла менавіта ў Горкі? Ні грама! І тлумачыць, чаму, я магу бясконца. Мне падабаецца сам працэс вучобы, а яшчэ я стала членам клуба творчай моладзі. Тым, хто скептычна глядзіць на гарады з насельніцтвам менш за сто тысяч чалавек, раю проста прыехаць сюды — самі паглядзіце, што ўсё зусім не кепска».

* * *

У гэтай жа акадэміі вучыцца і **Таня ПУТРЫК,** якая апынулася тут па іншых прычынах: «Я ўжо вучылася ў Мінску, але аднойчы не здолела здаць экзамен ды «вылецела» з універсітэта. Сядзела дома, а потым вырашыла: паступлю зноў! Толькі спецыяльнасць ужо іншую выберу. Зноў здала цэнтралізаванае тэсціраванне, як і ўсе. На жаль, не вельмі паспяхова. Спачатку думала застацца ў сталіцы, але ў той жа час вельмі не хацелася ісці на «завочку»… У апошні дзень сказала сабе: «Што будзе, тое хай будзе!» — ды сабрала валізкі.

Бацькі, усе сябры, знаёмыя падумалі, што гэта, напэўна, жарт такі своеасаблівы. Перапытвалі па сто разоў, чаму я «жыццё сабе ламаю»? Але жах «завочкі» перамог, і я адважылася, хоць спачатку сама не верыла, што з'язджаю з Мінска.

Тым, хто скептычна глядзіць на гарады з насельніцтвам менш за сто тысяч чалавек, раю проста прыехаць сюды — самі паглядзіце, што ўсё зусім не кепска.

Некаторыя і зараз не разумеюць, што я тут раблю. Я ж пакуль што зусім не шкадую аб прынятым рашэнні. Казаць катэгарычна не буду, бо прайшло няшмат часу.

Так, тут, вядома, больш сумна, чым у сталіцы: заўсёды адзін і той жа маршрут для шпацыру. З плюсаў — ціха ды спакойна. Сумую па родных, тым больш што ехаць дадому гадзін шэсць. Што мяне ратуе — гэта кінатэатр!»

* * *

Сваю гісторыю расказала і **Дар'я УРБАН,** студэнтка Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Гомель, безумоўна, не Горкі, але ў параўнанні з Мінскам, адкуль з'ехала Даша, усё ж такі горад не такі вялікі:

«Паехала вучыцца ў Гомель па банальнай прычыне: не прайшла на «бюджэт» у сталіцы. Дарэчы, мой хлопец адразу збіраўся ў Гомель паступаць, але ў яго, на жаль, не атрымалася.

Спачатку жыццё тут здавалася вельмі сумным. Потым вучыцца стала складаней. Таксама з'явіліся новыя сябры. Сумаваць часу не засталося! А каб наведваць бацькоў, амаль кожны тыдзень езджу ў сталіцу.

Людзі не перастаюць здзіўляцца, як можна было паехаць у Гомель з Мінска, без сяброў, зусім адной. Бацькі нават спрабавалі адгаварыць мяне, бо вельмі знерваваліся… Але я цвёрда вызначылася: буду доктарам! Мары павінны здзяйсняцца.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Зараз я не магу сказаць, шкадую ці не. З аднаго боку, не, бо з дзяцінства хацела лячыць людзей. З другога — знікла магчымасць бачыцца з дарагімі мне людзьмі, пра асабістае жыццё я і думаць забылася. Праўду кажуць, чужыя гарады «забіраюць» блізкіх. Часам вельмі хочацца, каб мяне падтрымала даўняя сяброўка. Магчыма, я яшчэ перавядуся ў Мінск. Хто ведае!»

* * *

Пагутарыўшы з дзяўчатамі, падумалася, што перспектыва вучобы за межамі сталіцы выглядае не так безнадзейна, як здавалася раней. Але ці так гэта сапраўды? Усе дзяўчаты скончылі толькі першы курс. І, мабыць, яшчэ не могуць успрымаць змены ў сваім жыцці аб'ектыўна. Гэту «версію» я вырашыла праверыць, і сустрэлася з **Уладзімірам БЕКІШАМ,** выпускніком Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта 2013 года, які ахвотна адказаў на мае пытанні.

— Як ты, мінчанін, стаў студэнтам Полацкага ўніверсітэта?

— Цяжка сказаць, выпадкова я выбраў ВНУ ці не, але на гэтае пытанне даводзілася адказваць не раз. Напэўна, пачну расказ з таго, што вывучыцца па спецыяльнасці «Праектаванне, будаванне і эксплуатацыя газанафтаправодаў і газанафтасховішчаў» можна толькі ў Полацкім дзяржаўным універсітэце: усяго 18 чалавек на год атрымліваюць дыплом з гэтым запісам. Калі казаць увогуле, то ў Полацку вучыцца шмат моладзі з Мінска. Ёсць яшчэ дзве прычыны, па якой абітурыенты прыязджаюць на перыферыю: не дабралі балаў, каб прайсці на бюджэт у мінскай ВНУ, або чалавек проста хоча вылучыцца і зрабіць не так, як усе. Я такога хлопца ведаю, але яго пасля першага курса адлічылі: пазабаўляўся, і жаданне працаваць ды вучыцца прайшло.

Знікла магчымасць бачыцца з дарагімі мне людзьмі, пра асабістае жыццё я і думаць забылася. Праўду кажуць, чужыя гарады «забіраюць» блізкіх.

— Як адрэагавалі сваякі і сябры на тваё рашэнне?

— На здзіўленне, збольшага нармальна, для іх было галоўнае, каб я атрымаў вышэйшую адукацыю. Бацькі казалі, што студэнт, які жыве пад матчыным крылом, — гэта не студэнт, і трэба ехаць пажыць асобна, паспытаць, як той казаў, сапраўднага студэнцкага жыцця ў інтэрнаце. З сябрамі сітуацыя была горшай, таму што ўсе яны «распаўзліся»: хтосьці сярэднюю спецыяльную адукацыю атрымліваў, хтосьці адразу пачаў працаваць, а хтосьці наогул за мяжу з'ехаў. Зараз са старых сяброў падтрымліваю сувязь толькі з адзінкамі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Не сумна было жыць у маленькім горадзе пасля ад'езду?

— На гэта пытанне не магу адказаць, таму што я не паспеў адчуць розніцу. Цэнтралізаванае тэсціраванне давялося здаваць у арміі, дзе я служыў адразу пасля школы, таму ехаў ва ўніверсітэт прама з казармы. Трапіў у студэнцкі інтэрнат, дзе можна было спаць, колькі хочаш, есці, колькі хочаш і што хочаш. Там былі дзяўчаты, там былі хлопцы — усё весела, усё выдатна.

— Пасля пяці гадоў, праведзеных у Полацкім універсітэце, не шкадуеш пра сваё рашэнне?

— Я ніколі ні пра што не шкадую! Магчыма, таму я так лёгка паехаў у іншы горад. Усё залежыць ад чалавека: калі табе не сумна з самім сабой, то будзе цікава ў любым месцы, знойдзеш, чым займацца.

Пасля размовы з героямі артыкула мяне прыемна ўразіла, што ніхто са студэнтаў не выказаў думкі наконт таго, што адукацыя ў рэгіёнах не адпавядае пажаданаму ўзроўню. Безумоўна, маё невялічкае даследаванне не прэтэндуе на ісціну ў апошняй інстанцыі, але мне здаецца, зараз перспектыва з'ехаць з Мінска дзеля атрымання адукацыі падаецца не такой ужо і безнадзейнай. А як лічыце вы?

Ганна ПЯРОВА.

Адпачынак у вёсцы

ГАЛОЎНАЕ — КАБ КАМПАНІЯ БЫЛА!

Я нарадзілася і вырасла ў вёсцы Велямічы, што ў Столінскім раёне. Велямічы вылучаюцца тым, што тут даволі шмат моладзі. У вольны час юнакі і дзяўчаты адпачываюць у дружных кампаніях. Вядома, у вёсках няма дарагіх рэстаранаў, вялікіх кіназал, паркаў з атракцыёнамі, як у горадзе, але ёсць месцы, якія моладзь наведвае з задавальненнем. Той жа мясцовы клуб. Тут заўсёды шматлюдна, ніхто не саромеецца — усе ведаюць адзін аднаго. Але асабліва добра бавіць вольны час у вёсцы летам. Я з цікавасцю паслухала сваіх сяброў і знаёмых, якія расказалі пра свой любімы адпачынак.

Ларысе Андрэйчук, вучаніцы 11 класа Веляміцкай СШ, вельмі падабаюцца вячэрнія прагулкі.

— Мы збіраемся з сяброўкамі і ідзём да возера ўвечары, бо ўдзень дапамагаем бацькам на агародзе і па гаспадарцы. Робім фотаздымкі, каб потым было што ўспомніць. Аднойчы мая сяброўка Хрысціна нарвала букет рамонкаў. Нас з кветкамі ўбачыў нейкі мужчына. Ён падышоў і сказаў, што прынясе нам лілей з возера. Спачатку мы падумалі, што незнаёмец жартуе. Але ён хуценька ўвайшоў у возера, паплыў, каб дастаць кветкі, а потым падарыў іх нам. Мы здзівіліся, але ў той жа час нам было прыемна.

— Летам, па магчымасці, я люблю ездзіць купацца, — расказвае мой сябар з суседняй вёскі Турское **Яўген Валодзька,** студэнт БДТУ. — Неяк мы з сябрамі ў невыносную спякоту вырашылі з'ездзіць на рэчку. Транспартам стаў мой нядаўна адрамантаваны матацыкл. Заехалі мы добра і пакупаліся з задавальненнем. А калі прыйшоў час ехаць дадому, то высветлілася, што тармазы перасталі працаваць. Каб ліквідаваць недахоп, патрэбны былі інструменты, якія, на жаль, я не ўзяў з сабой. Вось так і давялося нам траім цягнуць матацыкл па гравійцы пяць кіламетраў. Пакуль дайшлі — сем патоў сышло. Затое з тых часоў я ўжо заўсёды бяру з сабой інструменты, калі еду куды-небудзь на матацыкле.

— У душы кожны чалавек — дзіця, якому заўсёды хочацца забаў, — дзеліцца **Наталля Ранцэвіч,** вучаніца Велямiцкай СШ. — Нам з сяброўкай Ганнай падабаецца адпачываць у парку і катацца на атракцыёнах. На жаль, у нашай вёсцы няма такой магчымасці. Але не так даўно ў суседнюю вёску прывезлі атракцыёны. Пятнаццаць кіламетраў не сталі для нас перашкодай… Спачатку было крыху страшна, а ўжо потым — весела. На атракцыёнах забаўляліся як моладзь, так і дарослыя. Паблізу стаяў шапік, дзе можна было купіць марожанае, поп-корн і салодкую вату. Адпачылі мы на славу.

— А для мяне самы цудоўны адпачынак — футбол. Спорт заўсёды быў неад'емнай часткай майго жыцця. Нездарма я выбраў для навучання Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, — расказвае **Іван Фляр'яновіч** з вёскі Вялікае Малешава.

А вось **Сняжана Петравец** з Перасад гаворыць, што ў вёсцы зусім няма куды пайсці:

— У нас весела толькі на Купалле. Мы з сябрамі збіраемся каля ракі, паблізу якой гарыць вялікае вогнішча. Там жа праходзіць святочны канцэрт і спаборніцтвы сярод моладзі. Мы нават ходзім шукаць папараць-кветку. А раптам каму пашчасціць? (*Усміхаецца.*) Потым — дыскатэка. Яшчэ па вечарах мы з сябрамі катаемся на матацыклах.

Часта вясковыя юнакі і дзяўчаты гавораць, што ў іх вёсцы сумна, нецікава і няма дзе адпачыць. Насамрэч — гэта не так. Пры жаданні і кампанія знойдзецца, і забавы, і месца для адпачынку.

Марына ЛЯШКЕВІЧ,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.

Кінь выклік самому сабе!

«ВУЛІЧНЫ СПОРТ» ДАСТУПНЫ КОЖНАМУ

II Рэспубліканскі фестываль Srteet Workout пройдзе 28 ліпеня на пляцоўцы побач з Палацам спорту ў Мінску.

Srteet Workout (у перакладзе з англійскай мовы — вулічная трэніроўка) узнік як рух у ЗША ў 2008 годзе і стаў даступнай альтэрнатывай заняткам у дарагіх фітнэс-клубах. Яго неад'емная частка — свабода і магчымасць прыдумляць новыя практыкаванні і камбінацыі, ператвараючы трэніровачны працэс у гульню. Характэрнай рысай гэтага руху з'яўляецца яго даступнасць: займацца вулічным спортам можа абсалютна кожны, незалежна ад полу і ўзросту. Для заняткаў не патрабуецца ні дарагога абсталявання, ні спецыяльнай экіпіроўкі — дастаткова дваровай спартыўнай пляцоўкі. Srteet Workout спалучае базавыя элементы спартыўнай гімнастыкі на турніку і брусах.

У Беларусі гэты рух імкліва набірае папулярнасць — колькасць ахвотных удасканальвацца на спартыўных пляцоўках з кожным годам расце. Сёння, па ацэнцы актывістаў руху, у Беларусі ужо больш як 10 тысяч маладых людзей актыўна займаюцца вулічным спортам.

Турнір «Coca-Cola Srteet Workout», які пройдзе ў рамках фестывалю, — гэта выклік, які кожны ўдзельнік кідае самому сабе. Гэта можа быць як барацьба з уласнай лянотай, рашэнне ўпершыню падысці да турніка, так і новая вышыня ў трэніровачным працэсе. Прычым элемент саперніцтва ў Srteet Workout адыходзіць на другі план. Галоўная мэта турніру — прыцягнуць як мага больш маладых людзей да актыўных заняткаў фізічнай культурай. Здаровы лад жыцця па сілах кожнаму!

Надзея НІКАЛАЕВА.